# Унікальнае сховішча ведаў

16.09.2022 15:18

**Гэтымі днямі прадстаўнікі культурнай супольнасці нашай краіны адзначаюць яшчэ адну значную дату: 100-годдзе скарбніцы ведаў, светача беларускай культуры — Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**



З гэтай нагоды 13 верасня ў кніжніцы ў галерэі «Атрыум» адбылося адкрыццё выставачнага праекта «Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра». Паводле арганізатараў, аснову экспазіцыі склалі архіўныя — як мастацкія, так і дакументальныя — фатаграфіі, якія дазваляюць убачыць мінулае, сучаснасць і будучыню асветніцкай установы «праз прызму творчага ўяўлення іх аўтараў». Адзін з найбольш ранніх здымкаў, прадстаўленых на выстаўцы, ілюструе перыяд, калі бібліятэка месцілася ў Юбілейным доме на тэрыторыі архіерэйскага падвор'я ў Мінску.

> Будынак 1913 года захаваўся і дагэтуль, ён стаіць побач з Цэнтральным Домам афіцэраў з боку праспекта Незалежнасці. Фота першых супрацоўнікаў бібліятэкі разам з легендарным дырэктарам Іосіфам Бенцыянавічам Сіманоўскім зроблена ў 1926 годзе ў дворыку кніжніцы. Цікава прасачыць, як з цягам часу змяняліся архітэктурныя выявы бібліятэкі. Адно ж заставалася нязменным: умяшчальня ведаў — заўсёды знакавы будынак.

Наведаўшы выставачны праект «Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра», прымеркаваны да 100-годдзя галоўнай беларускай кніжніцы, гледачы змогуць даведацца і адчуць, чаму Нацыянальная бібліятэка сёння — гэта «найбуйнейшы інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр краіны, унікальнае сховішча нацыянальных дакументаў, установа, якая імкліва відазмяняецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу».

Вядома, гэткага поспеху дасягнуць было б немагчыма, калі б не верныя супрацоўнікі, чые шэрагі на працягу стагоддзя толькі пашыраліся. На здымках, якія па большай частцы дэманструюцца ўпершыню, яны, адданыя сваёй справе, таксама заўсёды побач.

**Каміла НАВІНКІНА**